**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ФІЛАРМОНІЯ**

# БЕЛАРУСКІ ПАЭТЫЧНЫ ТЭАТР АДНАГО АКЦЁРА "ЗНІЧ"

**Тэатральная зала Культурнага цэнтра Касцёла св.Сымона і св.Алены**

вул. Савецкая, 15 (пл.Незалежнасці)

***ДВАЦЦАЦЬ СЁМЫ ТЭАТРАЛЬНЫ СЕЗОН***

**80-ГОДДЗЮ БЕЛДЗЯРЖФІЛАРМОНІІ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА**

**КРАСАВІК 2017 г.**

| | |
|---|---|
| **05<br>Серада<br>19-00** | **"Нобіль – Барвяны Уладар"** ***У. Караткевіч***<br>*Монаспектакль паводле аповесці "Сівая легенда"*<br>Аўтар інсцэніроўкі, рэжысёр, выканаўца – заслужаны артыст РБ **Уладзімір Шэлестаў**<br>*20 – 30-ыя гг. XVII ст. на Беларусі прынята лічыць смутнымі часамі. Таму зусім невыпадкова Ул. Караткевіч – аўтар аповесці "Сівая легенда" (першапачатковая назва "Раман Ракута") дае слова расповеду швейцарцу Конраду Цхакену, наёмнаму ваяру ў Рэчы Паспалітай. Яго маналог ператвараецца ў легенду аб нашым народзе.* |
| **06<br>Чацвер<br>15-00** | **"Вясёлая каруселя"** ***А. Вольскі***<br>*Дзіцячы монаспектакль-сустрэча для дзяцей 7 – 10 гадоў.*<br>Выканаўца – заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь **Ларыса Горцава**<br>Музычнае суправаджэнне – **Дар'я Неўмяржыцкая** *(цымбалы)*<br>*Ларыса Горцава на "чароўнай каруселі" вядзе гледача па жыцці і творах выдатнага беларускага паэта А.В. Вольскага. Вершы, гульні, казкі, загадкі і розныя прыгоды – усё гэта чакае юнага гледача.* |
| **10<br>Панядзелак<br>15-00** | **"Маленькі Анёлак"** ***С. Кавалёў***<br>*Монаспектакль паводле вершаў Кармэн Барнос дэ Гаштольд*<br>Выканаўца – вядучы майстар сцэны **Раіса Астрадзінава**<br>Рэжысёр-пастаноўшчык – **Галіна Дзягілева**<br>*Твор французскай пісьменніцы К.Б. дэ Гаштольд "Малітвы жывёлаў" – гэта просьбы розных жывых істотаў, "братоў нашых меншых", да Бога. А перадае гэтыя просьбы да Усявышняга анёлы і маленькія анёлкі – лёгкія незямныя істоты, створэнні з крыльцамі. Адзін з такіх анёлкаў стаўся героем нашага спектаклю.*<br>***Для дзяцей 7 – 10 гадоў.*** |
| **19-00** | **Да 135-годдзя Якуба Коласа – "Красёнцы жыцця"**<br>*Паэтычна-драматычны монаспектакль паводле паэмы "Новая зямля"*<br>Выканаўца – заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь **Алесь Кашпераў**<br>Аўтар інсцэніроўкі, рэжысёр-пастаноўшчык – **Галіна Дзягілева**<br>*Паэма Якуба Коласа "Новая зямля" з'яўляецца сапраўднай і надзвычай каштоўнай энцыклапедыяй жыцця. Галоўны герой Міхал нарадзіўся, вырас і жыў на зямлі, якую не проста разумеў і любіў – якой дыхаў, з якой зрадніўся, якую б жадаў назваць сваёй. Але няўмольны лёс наканаваў іншае... Цяжкай была дарога гэтага чалавека, аднак ён не губляў веры ў яе шчаслівае завяршэнне.*<br>*У спектаклі гучаць народныя мелодыі і песня "Дарогі" кампазітара Алега Залётнева.* |
| **17<br>Панядзелак<br>15-00** | **"Палескія рабінзоны"** ***Я. Маўр***<br>Аўтар інсцэніроўкі, выканаўца – заслужаны артыст РБ ***Уладзімір Шэлестаў***<br>*Монаспектакль распавядае пра тое, як два юнакі Мірон Бажко і Віктар Каляга пад уражаннем прыгодніцкіх кніг аб далёкіх заморскіх краінах падчас вясновых канікул захацелі пабачыць славутае Палескае разводдзе. Гледачы спектакля разам з героямі адпраўяцца ў цікавую вандроўку, а таксама даведаюцца, як здабываць агонь, рабіць гаспадарчыя прылады, шукаць ежу.* ***Для дзяцей 9 – 14 гадоў.*** |
| **19-00** | **"Не праклінай, што я люблю" Н. Гілевіч**<br>*Паэтычны монаспектакль паводле вершаванага рамана "Родныя дзеці"*<br>Аўтар інсцэніроўкі, рэжысёр-пастаноўшчык – **Галіна Дзягілева**<br>Выканаўца – вядучы майстар сцэны **Мікалай Лявончык**<br>Музычнае суправаджэнне – **Дар'я Неўмяржыцкая** *(цымбалы)*<br>*Монаспектакль паводле вершаванага рамана Н.Гілевіча "Родныя дзеці". Твор самабытны, глыбока нацыянальны і па духу, і па моўных сродках. Даследчык беларускага фальклору, быту, тонкі знаўца жывой народнай гаворкі, Ніл Гілевіч стварае своеасаблівую паэтычную сюіту, дзе гарманічна зніто ўваюцца гумарыстычныя ноты і праніклёная, шчымлівая музыка кахання, чуюцца напевы роднай зямлі...* |

| | |
|---|---|
| **20<br>Чацвер<br>15-00** | “**<u>Граф Глінскі – Папялінскі</u>**” ***А. Вольскі***<br>*Лялечны монаспектакль*<br>Рэжысёр, выканаўца – вядучы майстар сцэны **Вячаслаў Шакалідо**<br>*Незвычайная гісторыя адбылася з сябрамі – хлопцам Марцінам і катом Максімам. Пасля розных перапетый прыгодніцкага лёсу і пры разумных паводзінах ката Максіма, хлопец Марцін пераўтварыўся ў графа Глінскага-Папялінскага. А ці зрабіўся ён ад гэтага больш значным і шчаслівейшым?* ***Для дзяцей 7 – 12 гадоў.*** |
| **27<br>Чацвер<br>15-00** | “**<u>Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага</u>**” ***П.Васючэнка, С.Кавалёў***<br>*Лялечны монаспектакль*<br>Выканаўца – вядучы майстар сцэны **Вячаслаў Шакалідо**<br>*Спектакль-казка пра прыгоды двух паноў, якія нічога не рабілі. Гаспадарка ў іх у заняпадзе – ні жывёлы, ні хлеба. Таму пайшлі яны ў свет лепшай долі шукаць.*<br>***Для дзяцей 8 – 12 гадоў.*** |
| **19-00** | “**<u>У краіне светлай, дзе я ўміраю</u>**” **М. Багдановіч**<br>*Музычна-паэтычны монаспектакль*<br>Аўтары інсцэніроўкі – ***Вячаслаў Статкевіч, Аляксандр Шундрык***<br>Рэжысёр-пастаноўшчык – ***Галіна Дзягілева***<br>Выканаўца – вядучы майстар сцэны ***Вячаслаў Статкевіч***<br>Музычнае суправаджэнне (гітара, вакал) – ***Сяргей Сарокін***<br>*Інсцэніроўка, па якой зроблены спектакль, складзена з твораў М.Багдановіча і ўключае ў сябе самыя вядомыя з іх. У аснове сюжэта Апокрыф, які можна лічыць своеасаблівым паэтычным Евангеліем. Драматургію спектакля рухае нечаканасць настрояў, рытм ствараюць песні, якія яшчэ больш раскрываюць перад намі розныя праявы памкненняў паэта.* |

**Дырэктар-мастацкі кіраўнік тэатра “Зніч”** **Галіна Дзягілева**

**Даведкі па тэл.: +375 17 331 75 53 (гарадскі); +375 29 1 117 118 (VEL); +375 33 601 77 70 (МТС)**
**e-mail: teatr-znich@yandex.by**

**Заказ білетаў у Інтэрнэце: www.philharmonic.by**

**Нашы інфармацыйныя партнёры:**

TUT.BY relax.by chatoff.by taximag.by Полезный журнал в Интернете КУЛЬТПРОСВЕТ